http://www.etnolog.org.ua

# ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў СУЧАСНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ *

**Галіна Каспяровіч**

**УДК 39(=161.3)**

У артыкуле характарызуецца дзейнасць Цэнтра даследванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі па вывучэнні этнакультурнай спадчыны беларускага народа, акрэсліваюцца асноўныя накірункі фундаментальных і прыкладных праблем ў галіне культуры, акцэнтуецца ўвага на ўзаемасувязях і навуковым супрацоўніцтве з Інстытутам мастацтвазнаўства, фальклярыстыкі і этналогіі імя М. Т. Рыльскага НАН Украіны.

**Ключавыя словы:** этнакультурная спадчына, традыцыя, навуковае супрацоўніцтва, народнае дойлідства, духоўныя традыцыі народнай архітэктуры, традыцыі жывёлагадоўлі.

В статье характеризуется деятельность Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси по изучению этнокультурного наследия белорусского народа, очерчиваются основные направления разработки фундаментальных и прикладных проблем в области культуры, акцентируется внимание на взаимосвязях и научном сотрудничестве с Институтом искусствоведения, фольклористики и этнологии им. М. Ф. Рыльского НАН Украины.

**Ключевые слова:** этнокультурное наследие, традиция, научное сотрудничество, народное зодчество, духовные традиции народной архитектуры, традиции животноводства.

The article displays an outline of research into the ethno-cultural heritage of the Belarusians carried out by the Centre of Research into the Belarusian Culture, Language and Literature of the Belarusian National Academy of Sciences, characterizes major trends of investigating fundamental and applied issues in the sphere of culture, and accentuates the interrelations and scientific cooperation with the M. Rylskyi Institute of Art Studies, Folkloristics and Ethnology of the National Academy of Sciences of Ukraine.

**Keywords:** ethno-cultural heritage, tradition, scientific cooperation, folk architecture, spiritual traditions in folk architecture, animal-husbandry traditions.

У беларускай гуманітарнай навуцы прыярытэтным напрамкам даследаванняў з'яўляецца ўсебаковае вывучэнне беларускага народа, яго гісторыі, матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры. У сувязі з актывізацыяй працэсаў глабалізацыі, мадэрнізацыі грамадства на першы план выходзяць праблемы захавання ўнікальнай і багатай спадчыны, вызначэння шляхоў яе трансфармацыі і адаптацыі да сучаснага этнакультурнага развіцця. Вядучай навуковай установай, ва ўлонні якой распрацоўваюцца фундаментальныя і прыкладныя праблемы ў галіне культуры, з'яўляецца Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Цэнтр створаны ў 2012 годзе, у яго склад увайшлі тры філіялы: Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы, Інстытут мовазнаўства імя Я. Купалы, Інстытут літаратуразнаўства імя Я. Коласа. Спынімся больш падрабязна на дзейнасці Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, утвораны ў 1957 годзе. Структура Інстытута вызначаецца навуковымі галінамі і спецыяльнасцямі, па якіх вядуцца даследаванні. У складзе Інстытута налічваецца 8 аддзелаў: архітэктуры; выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; экранных мастацтваў; музычнага мастацтва і этнамузыкалогіі; тэатральнага мастацтва, старажытнабеларускай культуры; народазнаўства; фальклярыстыкі і культуры

* Даследаванне выканана пры фінансавай падтрымцы БРФФД у рамках праекта навуковых даследаванняў «Этнакультурная спадчына народаў Украіны і Беларусі ў кантэксце сучаснага этнакультурнага дыскурсу» № Г16К-029/1.

http://www.etnolog.org.ua



славянскіх народаў. Супрацоўнікі аддзелаў даследуюць фундаментальныя пытанні мастацтва, этналогіі і фалькларыстыкі; прапагандуюць беларускую культуру, рыхтуюць навуковыя кадры вышэйшай кваліфікацыі, вядуць інтэнсіўную работу па міжнародным навуковым супрацоўніцтве. Аддзел народазнаўства (да 2007 года — аддзел этналогіі) галоўную ўвагу надае даследаванню этнакультурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі, міжэтнічных сувязей беларусаў, рускіх, украінцаў і іншых народаў у галіне гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры. З 2016 па 2020 гады аддзел народазнаўства працуе над планавай тэмай «Сучасныя этнічныя традыцыі Рэспублікі Беларусь». Мэтай навукова-даследчай работы з'яўляецца ажыццяўленне комплекснага аналізу сучасных этнічных традыцый Рэспублікі Беларусь і навуковае абгрунтаванне іх ролі ў развіцці беларускага грамадства. Сярод прыярытэтных задач акрэслены: роль хрысціянскіх традыцый у сучасным беларускім грамадстве; характэрныя рысы традыцый выхавання ў сучасны перыяд; роль прафесійных традыцый у сучасным беларускім грамадстве; вывучэнне значэння сучасных дзяржаўных святаў, сучасных рыс каляндарных святаў у Рэспубліцы Беларусь.

Варта спыніцца на плённым шматгадовым супрацоўніцтве Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (дакладней яго філіяла Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору) з Інстытутам мастацтвазнаўства, фалькларыстыкі і этналогіі імя М. Т. Рыльскага НАН Украіны. Беларускія і ўкраінскія этнолагі, фалькларысты прымалі ўдзел у распрацоўцы такіх буйных навуковых праектаў, як «Народы сусвету», «Народы і культуры», «Рэгіянальны гісторыка-этнаграфічны атлас Украіны, Беларусі і Малдовы», па меншай меры ў дзесяці сумесных навуковых праектах. Беларускія і ўкраінскія навукоўцы заўсёды абменьваюцца вопытам, напрацоўкамі на міжнародных навуковых канферэнцыях. У абедзвюх навуковых установах выдаюцца зборнікі, уключаныя ў пералік ВАК па публікацыі вынікаў даследаванняў (у Беларусі — «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі», ва Украіне — «Народна творчісць та етнографія», «Фольклористичні зошиты» і інш.) Артыкулы зборнікаў прадстаўляюць вынікі па актуальных накірунках даследаванняў.

Украінскія вучоныя актыўна публікуюцца ў беларускіх зборніках і наадварот, такім чынам, адбываецца абмен вынікамі даследаванняў, якія спрыяюць, у тым ліку, і выпрацоўцы рашэнняў па праблемных напрамках гуманітарнай навукі. Нагадаем сумесныя манаграфіі па Палессю «Полесье: материальная культура» (В. К. Бондарчик и др. Киев, 1988), «Общественный семейный быт и духовная культура населения Полесья» (В. К. Бондарчик и др. Минск, 1987).

Акрамя таго, у Беларусі ў апошнія гады надрукаваны калектыўныя манаграфіі «Кто живет в Беларуси» (Минск, 2012), у якой разгледжана ў тым ліку і традыцыйная культура ўкраінскай дыяспары; шматтомнае выданне «Нарысы гісторыі культуры Беларусі» (Минск, 2014—2016). Розным аспектам культурнага ўзаемадзеяння дзвюх краін прысвечана перыядычнае выданне (штогоднік) «Белоруссия и Украина: история и культура» (М., 2003—2017).

У сумесным украінска-беларускім праекце «Этнакультурная спадчына народаў Украіны і Беларусі ў кантэксце сучаснага сацыякультурнага дыскурсу» (2016— 2018) прымаюць удзел 4 навуковыя супрацоўнікі. Спынімся сцісла на папярэдніх выніках даследаванняў беларускіх вучоных.

Акадэмік НАН Беларусі Аляксандр Іванавіч Лакотка, даследуючы сучасныя шляхі і тэхналогіі захавання народнага дойлідства, прааналізаваў методыку і гісторыю стварэння дзяржаўнага скансена і прыватных музеяў пад адкрытым небам, а таксама рэгіянальных этнаграфічных музеяў і мемарыяльных сядзіб. На думку Аляксандра Іванавіча, кансерватыўнасць традыцыйнага будаўніцтва была звязана з устойлівасцю гаспадарча-культурнага ўкладу, экалагічнымі фактарамі, што дазволілі і ў канцы XX ст. сустрэць у беларускіх вёсках

http://www.etnolog.org.ua



пабудовы з саламяным дахам ці трыснёгам, ветраныя і вадзяныя млыны, ткацкія кросны, драўляныя сохі, бароны, кузні, драўляныя храмы і шмат чаго іншага. Гэтыя рарытэты сталі асновай стварэння музея-скансена. У арганізацыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту прымалі удзел вышэйшае кіраўніцтва краіны, вучоныя, знакамітыя дзеячы культуры — пісьменнікі, мастакі.

У пасляваенны час помнікі драўлянага дойлідства захоўваліся ў першую чаргу па мемарыяльных прыкметах. Першым з такіх быў домік І з'езда РСДРП у г. Мінску.

Вялікая ўвага надавалася музеефікацыі помнікаў драўлянага дойлідства, звязаных з імёнамі знакамітых дзеячаў культуры. Найбольш буйным мемарыяльным комплексам з'яўляецца музеефікацыя месцаў і помнікаў, якія звязаны з іменем Янкі Купалы. Гэта драўляныя сядзібы ў Вязынцы, недалёка ад Заслаўя, таксама Акопы, Ляўкі Аршанскага раёна.

У 1980-я гады музеефікаваны буйны мемарыяльна-сядзібны комплекс, які звязаны з іменем беларускага паэта Максіма Багдановіча, у вёсцы Ракуцёўшчына Маладзечанскага раёна. Адначасова быў распрацаваны праект музеефікацыі дома ляснічага ў вёсцы Вязэе Асіповіцкага раёна, у якім калісьці спыняўся паэт. На мяжы XX–XXI ст. у сувязі з юбілейнымі датамі былі рэстаўрыраваны драўляныя сядзібы Адама Міцкевіча (Завоссе Баранавіцкага раёна), Францішка Багушэвіча (Кушляны Смаргонскага раёна), Іллі Рэпіна (Здраўнёва Віцебскага раёна), Міхала Клеафаса Агінскага (Залессе Смаргонскага раёна) і інш.

Да пачатку XXI ст. скансен як форма музеефікацыі помнікаў народнага дойлідства пачаў лічыцца менш прыярытэтным. Узнікла ідэя, што помнікі павінны рэстаўрыравацца і музеефікавацца ў сваім асяроддзі.

Нельга абысці праблему відавочных змен культуры драўлянага будаўніцтва. Калі яшчэ паўвека назад бервяно апрацоўвалася сякерай і пілой, несла адбітак рукі майстра, то цяперашнія пабудовы з дрэва, дачы і катэджы, аграсядзібы і двары будуюцца звычайна з ацыліндраванай стандартызаванай, апрацаванай антысептыкамі драўніны. Пэўная частка гэтых забудоў мае спрэчную эстэтыку. Ёсць і новая драўляная архітэктура, спраектаваная архітэктарамі, выразная, эстэтычная, эрганамічная, якая арганічна спалучаецца з прыродай.

Праблемы захавання драўлянай архітэктуры і развіцця традыцый, пераемнасці з'яўляюцца праблемамі сучаснай культуры у цэлым. Яны прадстаўляюць адбітак глыбіні грамадскай самасвядомасці, ідэнтычнасці, моцнай прыхільнасці да культурных каранёў.

Алена Генадзьеўна Алфёрава, загадчык сектара духоўных традыцый у народнай архітэктуры, даследуе асаблівасці бытавання і трансфармацыі традыцый духоўнай культуры беларусаў у гістарычна складзеных асяродках бытавання; у асабістасці звяртае ўвагу на міфапаэтыку, святочныя і абрадавыя традыцыі, уяўленні беларусаў аб навакольнай прасторы, якія валодаюць значным духоўным і выхаваўчым патэнцыялам. Галоўнай асаблівасцю гісторыка-культурнай спадчыны ў сучасным грамадстве з'яўляецца яе поліфункцыянальнасць, мабільнасць, адаптыўнасць да этнакультурнай сітуацыі ў зменлівым сацыякультурным асяроддзі.

Беларуская і ўкраінская духоўная культура багатая не толькі жанрава-відавой разнастайнасцю і міфапаэтычнымі характарыстыкамі вобразаў. Менавіта канкрэтныя аб'екты навакольнай рэчаіснасці, іх паэтычнае апісанне, кантэкст даюць яскравае ўяўленне пра нацыянальную самабытнасць, асаблівасці ўспрымання асяроддзя бытавання. Таму ў межах дадзенага праекта пры аналізе духоўнай спадчыны беларусаў і ўкраінцаў мэтазгодна засяродзіцца на параўнальным вывучэнні канкрэтных вобразаў, а менавіта — міфапаэтычнай інтэрпрэтацыі прасторы. Для больш дэталёвага аналізу былі абраны аб'екты навакольнай традыцыйнай культурнай прасторы беларусаў і ўкраінцаў, якія адлюстроўваюць сувязь з гістарычнымі і геаграфічнымі рэаліямі, канструкцыйнымі асаблівасцямі: паселішча і вуліца, непасрэдна жыллё, двор і гаспадар-

http://www.etnolog.org.ua



чыя пабудовы, царква (касцёл). Пры гэтым параўнальныя даследаванні вобраза жылля ва ўкраінскай і беларускай духоўнай традыцыі праводзяцца не толькі на ўзроўні непасрэдна паэтычных локусаў, але і, у межах кожнага аб'екта, на ўзроўні паэтыкі каляндарна-абрадавых, сямейна-абрадавых, пазаабрадавых песень, парэміялагічных жанраў.

У апошні час назіраецца адраджэнне цікавасці да народнага жылля, традыцыйнага асяроддзя бытавання ўсходніх славян і звязаных з ім уяўленняў. Пры гэтым новы віток гэтай цікавасці суадносіцца з новымі запытамі і запатрабаваннямі грамадства, у тым ліку з неабходнасцю развіцця нацыянальнай ідэі, магчымасцямі папулярызацыі і рэпрэзентацыі самабытнай народнай культуры на міжнароднай арэне, а таксама з развіццём новых напрамкаў, звязаных з захаваннем прыроднай і культурнай экалогіі. У прыватнасці, ідэйна-духоўным складнікам адраджэння сяла з'яўляецца гістарычна сфарміраванае асяроддзе бытавання (гісторыка-экалагічная прастора) і традыцыйнае культурнае асяроддзе (культурная прастора).

У навуковым праекце традыцыі жывёлагадоўлі беларусаў даследуе вядучы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства Г. І. Каспяровіч. Вывучэнне аднаго з надзвычай важных заняткаў беларусаў жывёлагадоўлі належыць да ліку прыярытэтных праблем у этналагічнай навуцы.

У другой палове XX — на пачатку XXI ст. жывёлагадоўля займае лідзіруючыя пазіцыі. Ва ўмовах інтэнсіўнай глабалізацыі, мадэрнізацыі аграрнай вытворчасці востра паўстае пытанне аб захаванні багатай і самабытнай культурнай спадчыны. Між тым гаспадарчая дзейнасць народа ўтрымлівае бясцэнныя артэфакты матэрыяльнай і духоўнай культуры, у якіх сканцэнтраваны вопыт, народныя веды, навыкі, звычаі, абрады, стэрэатыпы паводзін беларусаў. У гэтай сувязі неабходна выявіць механізмы захавання традыцый жывёлагадоўлі, іх адаптацыю і трансфармацыю на прыкладзе як калектыўных, так і асабістых сялянскіх і фермерскіх гаспадарак.

Прыярытэтную ролю ў забеспячэнні харчовай бяспекі краіны адыгрываюць сельскагаспадарчыя арганізацыі (1469). На аграпрамысловых комплексах сканцэнтравана 97,2 % буйнай рагатай жывёлы, у тым ліку 94,1 % кароў, 85,8 % свіней, 88,8 % птушкі [1, с. 129–130]. Вядучае месца ў галіне займае развядзенне буйнай рагатай жывёлы, інтэнсіўна развіваюцца свінагадоўля, птушкагадоўля. Па дадзеных Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі, у разліку на душу насельніцтва па вытворчасці мяса наша краіна зраўнялася з Германіяй (113 кг у год), а па вытворчасці малака — перавышае асноўныя развітыя ў аграрным дачыненні еўрапейскія краіны (708 кг). Надоі малака ад кожнай каровы з 2002 па 2015 гг. павялічыліся амаль у 2 разы (з 2500 да 4765 кг) [1, с. 165]. У пачатку XXI ст. у галіну прыйшлі новыя тэхналогіі гадавання, кормавытворчасці, кармлення жывёлы. За апошняе дзесяцігоддзе ў краіне істотна абноўлена інфраструктура малочнай жывёлагадоўлі, пабудавана і мадэрнізавана звыш 1000 малочна-таварных ферм. Шырока разгарнулася селекцыйная праца па замене чорна-пярэстай жывёлы гальштынізаванай пародай. Разам з тым масавы пераход на новыя тэхналогіі, а таксама кардынальны адрыў ад лепшых традыцый беларускага народа ў гадаванні, кормавытворчасці і кармленні, узнаўленні буйнай рагатай жывёлы на шэрагу сельскагаспадарчых прадпрыемстваў абазначылі пэўныя праблемы і невырашаныя пытанні ў галіне. Як сцвярджае беларуская прымаўка: «У каровы малако на языку». У адпаведнасці з традыцыямі беларусаў, кормам для кароў у асабістых падсобных і фермерскіх гаспадарках служаць травастоі на лугах і пашах, а ў зімні перыяд гаспадары кормяць жывёлу па магчымасці якасным сенам з дабаўленнем да яго караняплодаў і ў самай невялікай ступені канцэнтратаў. У рэспубліцы ў 2000-е гады ў шэрагу сельскагаспадарчых арганізацый укаранены пераважна сіласаканцэнтратны тып кармлення, які не адпавядае фізіялагічным патрабаванням буйнай рагатай жывёлы, вядзе да пагаршэння іх здароўя і выбыцця са статка. Не сакрэт,

http://www.etnolog.org.ua



што ў селяніна маці-карміліца карова служыць 15 год, а на крупных комплексах з сучаснай тэхналогіяй тры, іншы раз 4—5 год. У гэтай сувязі найбольш асцярожныя і прадбачлівыя кіраўнікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў не пайшлі на вялікія рэканструкцыі, мадэрнізацыю і адпаведныя ім крэдытныя займы, абмежаваліся навядзеннем парадку і дысцыпліны, удасканалілі сістэму падтрымкі мікраклімата на малочна-таварных фермах, захавалі лепшыя традыцыі — беражлівыя адносіны да жывёлы, перабольшванне ў кармленні травяных кармоў, стойлавае ўтрыманне жывёлы на глыбокай саломенна-навознай падсцілцы зімой, а летам выпас на пашах, што робіць больш таннай малочную прадукцыю.

Надзвычай важным фактарам, які ўплывае на вытворчыя паказчыкі, побач з кармамі і пародным складам з'яўляецца якасны догляд за жывёламі, клопат аб іх. Аналіз газет, часопісаў сельскагаспадарчай накіраванасці, уласных палявых матэрыялаў сведчыць аб значнасці чалавека на вытворчасці, асабліва высокатэхнічнай — кіраўнікоў гаспадарак, вядучых спецыялістаў, кіраўнікоў сярэдняга звяна, аператараў машыннага даення, жывёлаводаў, пастухоў і работнікаў іншых масавых прафесій. Таццяна Васільеўна Тубольцава — аператар машыннага даення КСУП «Красная Армія» Рагачоўскага раёна тлумачыць сакрэты свайго майстэрства: «Мало доить корову, ее еще и любить нужно» [2]. Кацярына Парфір'еўна Ляснічая, былая даярка знакамітай гаспадаркі «Аснежыцкі», якая ў 1966 годзе дасягнула ўдою малака ад каровы 7000 кг і атрымала званне «Герой Сацыялістычнай Працы» слушна заўважае, што традыцыі чалавечых адносін да жывёлы пераходзяць і на высокатэхналагічныя фермы: «Новая змена жывёлаводаў працягвае нашу справу. Белыя халаты аператараў машыннага даення, камп'ютары, аўтаматыка. Але галоўнае засталося: каровы як і раней розныя па нораву. Кожную трэба адчуць, дагледзець, і толькі тады добры вынік не абміне» [3].

У 2010-я гг. калектыўныя гаспадаркі больш увагі сталі ўдзяляць пасевам кармавых траў, у асабістасці бабовых, выкарыстанню традыцый пасьбы буйнай рагатай жывёлы. Асобныя традыцыі захоўваюцца і ў гадаванні свіней, птушак. Так, да прыкладу на сучасных комплексах свінні знаходзяцца на глыбокай саламянай падсцілцы, а на птушкафабрыках на замену антыбактэрыяльных прэпаратаў прыйшлі прабіётыкі і фітапрэпараты.

У структуры жывёлагадоўлі значна зменшылася роля авечкагадоўлі і конегадоўлі. У той жа час гэтыя галіны лепш захавалі традыцыі ў гадаванні, кармленні, узнаўленні статкаў.

У сучасным аграрным комплексе Беларусі конегадоўля набывае пераважна племянны і спартыўны накірунак. У конегадоўчай гаспадарцы маюцца 3 конных завода, больш за 30 конеферм. Вядучая роль належыць дзяржаўным конным заводам, якія займаюцца развядзеннем і ўдасканальваннем конскіх парод (беларускай запражной, рускай цяжкавознай, рускай рысістай), вырошчваннем высокакласных спартыўных коней і племянных вытворнікаў для конеферм. У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорта і конегадоўлі, 5-ці цэнтрах алімпійскага рэзерва, 13 дзіцяча-юнацкіх школах па коннаму спорту займаюцца 1 645 спартсменаў, працуюць 88 штатных трэнераў.

У падсобных сялянскіх гаспадарках (іх у 2016 годзе налічвалася каля 1 млн) гадуецца 5,7 % кароў, 13,4 % свіней, 59,8 % коней, 69,5 % авечак, 10,7 % птушкі, 82,7 % пчаласем'яў [1, с. 131]. Яны вырабляюць кожнае чацвертае яйка, 6 % малака і 6 % мяса ад усёй вытворчасці [1, с. 149]. За 2011—2016 гг. колькасць буйнай рагатай жывёлы, у тым ліку кароў, таксама свіней, коней паменшылася ў два разы, на 1,1 млн галоў скарацілася пагалоўе птушкі.

У структуры прадукцыі фермерскіх гаспадарак (2500, 2016 г.) толькі 10—14 % складае прадукцыя жывёлагадоўлі. Невялікая іх вага ў агульным аб'ёме вытворчасці: па малаку — 0,2 %, рэалізацыі жывёлы і птушкі — 0,6 %, па яйках — 0,04 %) [1, с. 149].

http://www.etnolog.org.ua



Разам з тым у гаспадарчай дзейнасці сельскіх падворкаў найбольш поўна захоўваюцца традыцыі жывёлагадоўлі (стаўленне да жывёлы, кармленне, лячэнне, узнаўленне). Багаты вопыт, навыкі вядзення жывёлагадоўлі перадаваліся з пакалення ў пакаленне, становіча ўплывалі на такія важнейшыя рысы беларускага народа як працавітасць, памяркоўнасць, адказнасць, разважлівасць. Вялікае значэнне маюць экалагічныя функцыі хатніх гаспадарак, якія вырабляюць экалагічна чыстыя прадукты харчавання.

Важным уяўляецца даследаванне абрадаў беларусаў, звязаных з жывёлагадоўляй, як асяроддзя захавання і трансфармацыі аўтэнтычнай спадчыны. Да даследавання традыцыйнага абрадава-паэтычнага комплекса падключыліся не толькі этнолагі, фальклрысты, але і культработнікі, настаўнікі, вучні старэйшых класаў, студэнты вышэйшых навучальных устаноў. Свята першага выгана жывёлы на пашу — Юр'е — узноўлены ў шэрагу паселішчаў Міншчыны. У Гомельскай вобласці ініцыятарам правядзення юр'еўскіх абрадаў на вёсцы выступае аўтэнтычны фальклорны калектыў «Міжрэчча» Пагостскага сельскага клуба Жыткавіцкага раёна. Абраду «Юр'еўскі карагод» першаму ў Рэспубліцы Беларусь прысвоены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. У гэтай жа вобласці ў вёсцы Казацкія Балсуны захаваўся старажытны ўнікальны абрад «Ваджэння стралы», галоўнай функцыяй якога з'яўляецца зберажэнне свойскай жывёлы ад маланкі. У абрадавых дзеяннях удзельнічаюць жыхары вёскі. Старадаўняе свята «Сена» штогод праходзіць у в. Старае сяло Веткаўскага раёна з удзелам фальклорнага калектыва і жыхароў вёскі.

Шырока распаўсюджаны новыя ўрачыстасці жывёлаводаў — злёты, пасяджэнні дзевяці-, васьмі- і сямітысячніц, аператараў машыннага даення, якія надаілі у год ад каровы не менш 7 тыс. кілаграмаў малака і забяспечылі лідэрства ў вобласці, вечары ўшанавання працоўных дынастый, юбіляраў. У Бярозаўскім раёне на тэрыторыі Рэспубліканскага біялагічнага заказніка «Спораўскі» штогод праходзіць экафестываль — адкрыты чэмпіянат касцоў «Спораўскія сенакосы», на якія прыязджаюць каманды касцоў як з Беларусі, так і з Украіны, Германіі, Літвы. Удзельнікі маюць свае форму і косы. Асобныя касцы маюць рарытэтныя косы 1960-х і нават 1938-х гадоў. Па правілах конкурсу патрэбна скасіць дзялянку даўжынёй сто і шырынёй тры метры максімальна чыста і хутка, улічваецца нават грэбень і вышыня скоса [4].

Разам з тым традыцыйны комплекс абрадаў, вуснапаэтычная творчасць беларусаў, звязаная з жывёлагадоўляй, да цяперашняга часу значна трансфармаваліся. Асобныя старажытныя элементы абраднасці (абрадавыя дзеянні пры выпасе жывёлы ў полі ў Юр'еў дзень, сумесныя трапезы, іграввыя элементы) захаваліся ў асабістых гаспадарках сялян. Амаль не гучаць юраўскія песні. З пераходам жывёлагадоўлі на прамысловую аснову ў калектыўных гаспадарках традыцыйная абраднасць практычна не задзейнічана.

Падводзячы вынікі даследавання, адзначым, што традыцыі культуры беларусаў адаптуюцца да новых умоў жыцця, захоўваючы пры гэтым свае базавыя асновы, спрыяюць перадачы традыцыйнага ладу жыцця, сэрэатыпаў паводзін, умацаванню самасвядомасці народа.


1. Сельское хозяйство Республики Беларусь. Стат. сборник. – Минск, 2016. – 229 с.

2. *Яско А.* Мало доить, важно любить. Рогачевские уроки большого молока / А. Яско // Сельская газета. – 2016. – 18 июня. – С. 6.

3. *Субат У.* Святло нязгасных зорак / У. Субат // Сельская газета. – 2016. – 19 марта. – С. 24–25.

4. *Ковалев К.* Коси коса, пока «Спорово» / К. Ковалев // Сельская газета. – 2015. – 16 июля. – С. 3.

5. *Курэц А.* Звінелі косы на «Спараўскіх сенакосах» / А. Курэц // Беларуская ніва. – 2012. – С. 7.